5. *Фадзеева В.Я.* Беларуская народная вышыўка. – Мн., 1991.

*В.Л.Хмурчык*

# АДЛЮСТРАВАННЕ СЭНСУ ЖЫЦЦЯ Ў СТУДЭНЦКАЙ СУБКУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ

Студэнцкая субкультура – мультыкультурны феномен. Разнастайнасць, поліфанічнасць, паралельнае існаванне розных напрамкаў характарызуюць рух субкультуры моладзі. У гэтай з'яве прысутнічае аб'яднанне дзвюх плыняў:

– нацыянальна-культурных традыцый этнасу, прадстаўнікамі якога з'яўляецца студэнцкая моладзь. Яны праяўляюцца ў ментальнасці, менталітэце, нацыянальным характары дастаткова статычныя ў часе;

– сацыяльных сувязей індывіда з членамі групоўкі і светам у цэлым. Яны маюць зменлівы і дынамічны характар. Гэта прасторава-часавая характарыстыка соцыуму моладзі.

Кожны прадстаўнік субкультуры студэнцтва мае свой, суб'ектыўны погляд на свет, свае думкі пра сэнс чалавечага існавання. Паводле меркавання Б.Р.Ананьева, вызначаны ўзрост сензітыўны для развіцця асноўных сацыягенных патэнцый чалавека. Адбываюцца павелічэнне памяркоўнасці ў дзейнасці, авалоданне лагічнымі аперацыямі, самастойная рэгуляцыя сваіх паводзін. У студэнцкі час ламаюцца ўсе дынамічныя стэрэатыпы. Знешнія фактары, якія развіваюць асобу, прыводзяць у рух і самарух унутраныя псіхалагічныя працэсы. Прафесіяналізуюцца (ускладняюцца і разгаліноўваюцца) псіхалагічныя станы, вопыт.

У працэсе зносін на ўзроўні суб'ект–суб'ект самасвядомасць студэнта, здольная да ўспрымання новай інфармацыі, пашыраецца. Гэтая з'ява садзейнічае далейшаму росту асобы маладога чалавека. Але сувязь на ўзроўні суб'ект–суб'ект адбываецца толькі пры даверлівым кантакце з выкладчыкам, блізкім чалавекам ці ў нефармальным гурце з равеснікамі. Замкнёнасць суб'екта на сувязі з якой-небудзь сацыяльнай групай накладвае адбітак на яго светапогляд. Ён становіцца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абмежаваным, не накіраваным на рэалізацыю сваёй жыццёвай праграмы. Праз рэалізацыю жыццёвай праграмы адбываецца актуалізацыя асобы суб'екта.

Зносіны паміж людзьмі розных сацыяльных слаёў пашыраюць светапогляд. Індывід уключаецца не толькі ва ўзаемадзеянне з навакольнай культурай, ён успрымае свет як цэлы, адзіны і непадзельны, адбываецца сувязь на ўзроўні універсума. Але галоўнай умовай зносін на самым высокім узроўні з'яўляецца гарманічнае развіццё іх на бліжэйшым узроўні. Таму блізкае асяроддзе індывіда дае напрамак для далейшага развіцця асобы, яе светапогляду і сэнсу жыцця.

Сэнс жыцця – катэгорыя, пакладзеная ў аснову арыентацый на каштоўнасці. Аднак высветліць яго сапраўднае разуменне даволі цяжка. С.Л.Франк пад сэнсам жыцця разумеў мэтазгоднасць, усё тое, што вядзе да мэты ці дапамагае яе ўвасобіць у жыцці. Сэнс жыцця пастаянна ўдакладняе мэту. Мэты залежаць ад глыбіні самасвядомасці кожнай асобы, ад прыярытэтных каштоўнасцей, якімі індывід кіруецца. У М.Хайдэгера тлумачэнне сэнсу жыцця заключаецца ў пошуку гармоніі чалавека і свету.

К.Б.Сакалоў у сваёй канцэпцыі субкультуры моладзі дае асноўны канцэптуальны тэрмін – “карціна свету”. Гэты тэрмін становіцца вядучым для высвятлення і далейшай класіфікацыі груповак моладзі ў соцыуме. У кожнага прадстаўніка вызначанай групоўкі карціна свету павінна амаль супадаць, нават калі індывід меў іншы погляд на свет. Ён яго зменіць, калі прыстасуе да сябе сістэму каштоўнасцей пэўнага субкультурнага руху моладзі. Атрымліваецца, што сістэма каштоўнасцей пастаянна трансфармуецца пры ўздзеянні нейкіх сацыяльных змен.

Мы схільныя лічыць, што працэс трансляцыі каштоўнасцей не можа адбывацца толькі пры дапамозе ўз'яднання асобы з якой-небудзь групоўкай моладзі. Карціна свету закладваецца ў свядомасці чалавека значна раней, чым у часы студэнцтва. Карціна свету – дастаткова статычны стэрэатып. Але мы не адмаўляемся ад таго, што змяняюцца былыя і фарміруюцца новыя дынамічныя стэрэатыпы – арыентацыі на каштоўнасці. І іх асноўнай катэгорыяй з'яўляецца сэнс жыцця чалавека, які знаходзіцца ў акрэсле-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ных субкультурных умовах. Сфарміраваная карціна свету індывіда раскрываецца пры ўзаемадзеянні яго з сацыяльным асяроддзем, якое ён падбірае ці вымушаны ў ім знаходзіцца. Гэта і ёсць вызначаныя ўмовы – субкультура моладзі, якая аптымальна падыходзіць да раскрыцця жыццёвай стратэгіі маладога чалавека. Пры гэтым сэнс жыцця з'яўляецца прынцыпам, які накіроўвае выбар у бок той ці іншай групоўкі моладзі.

Сацыякультурныя фактары – вызначаны стан эпохі, у якой існуе індывід. Постмадэрнізм, безумоўна, накладвае адбітак на фарміраванне светапогляду маладога пакалення. Але ён не іграе рашаючай ролі ў выбары сэнсу жыцця. Сэнс жыцця – феномен як індывідуальнага характару, так і сацыякультурнага. Адбываецца аб'яднанне ў свядомасці суб'ектыўна заданай мэты індывіда і патрабаванняў эпохі, у якую жыве малады чалавек. Сэнс жыцця вынікае з мінулага індывіда, суадносіцца з яго будучымі жаданнямі і адпавядае магчымасцям цяперашняга часу. Гэта мэты, якія з'яўляюцца невялікімі па значнасці на шляху да раскрыцця і рэалізацыі асобы. Мэтамі з'яўляюцца думкі, якія вымушаюць чалавека ісці па дарозе жыцця.

На прыкладзе хіпі, толкіністаў, готаў і іншых груповак моладзі паспрабуем разгледзець іх інтэрпрэтацыю сэнсу жыцця. Пад сэнсам жыцця мы разумеем тыя каштоўнасці, якія індывіды лічаць важнымі ў сваёй жыццёвай стратэгіі. Паводле меркавання В.Франкла, тое, што чалавек сёння лічыць каштоўнасцю, заўтра будзе яго сэнсам жыцця.

Хіпі не прымаюць рэчаіснасць такой, якая існуе. Гэтыя маладыя людзі жывуць у асаблівым свеце – свеце, дзе няма месца гвалтаванню і нянавісці. Яны захоплены сузіраннем сваёй душы і цярпліва адносяцца да любога неардынарнага светапогляду, калі ён не супярэчыць асноўнай каштоўнасці хіпі – быць незалежным, не звязаным ніякімі абавязацельствамі ні сярод блізкіх, ні сярод грамадства.

Сэнс жыцця хіпі – незалежнасць. Рабіць добра (у адпаведнасці з арыентацыямі хіпі на каштоўнасці) – значыць не наносіць шкоды іншаму чалавеку. У такім разуменні рэчаіснасці бачылі свет усе ўсходнія рэлігіі. Менавіта ў знешняй мяккасці строга прасочвалася сувязь з упэўненай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

жыццёвай пазіцыяй, якую нельга было зламіць. У свядомасці хіпі дамінуе арыентацыя на цяперашняе, ён не клапоціцца аб сваім будучым, не памятае сваё мінулае. Гэта прыстасаванне да змен у грамадстве. Каштоўнасць жыцця хіпі – нязменная сутнасць сваёй душы пры знешняй змене з'яў жыцця. Да змен можна прывыкнуць. Рух хіпі – гэта першая хваля светапогляду моладзі 60–70-х гг. XX ст., іх сэнс жыцця – адаптаваць сябе да новай рэчаіснасці свету хуткіх змен.

Толкіністы – прадстаўнікі інтэлектуальнага кірунку ў субкультуры моладзі. Сфера цікавасці іх – мінулае, яны захапляюцца заходнееўрапейскай культурай у асобай інтэрпрэтацыі. Гэта захапленне аб'ядноўвае ў свядомасці з'явы патэнцыяльна магчымыя, напрыклад традыцыі рыцарства і з'явы, якія немагчыма ўявіць (жыццё эльфаў, друідаў і іншых персанажаў заходнееўрапейскага фальклору). Каштоўнасць жыцця толкіністаў заключана ў рамантычнай іроніі, якая суправаджала драматургаў эпохі рамантызму. Каштоўнасць субкультуры толкіністаў – у паралельным існаванні двух светапоглядаў, рэалістычнага і рамантычнага. Сэнс іх жыцця – у сумяшчэнні рэчаіснасці, якая суіснуе, з ірэальным светам фантазіі. Гэты погляд асабліва актуальны зараз, калі адбываецца змена постіндустрыяльнага грамадства на новае, інфармацыйнае. Пераадольваецца ўнутраны канфлікт паміж трансфармацыйнымі працэсамі ў грамадстве і жыццём чалавечага духу. Такім чынам, у светапоглядзе толкіністаў пераважае арыентацыя на мінулае. Адыход ад рэчаіснасці – галоўны сэнс іх жыцця.

Гатычная субкультура моладзі атрымала ад сваёй папярэдніцы – субкультуры панкаў – знешняе прыпадабненне актыўнай дзейнасці. У гатычнай субкультуры пераважае форма над зместам, назіраецца юнацкая тэндэнцыя мець адметны ад іншых знешні выгляд, негатыўнае ўспрыманне рэчаіснасці. Готы звяртаюцца да рамантызму, сярэднявечча, але спрошчваюць успрыманне гісторыі. Галоўнае ў гатычнай субкультуры – не думкі, не ідэі, а знешні выгляд, які кідае выклік грамадству. Каштоўнасць субкультуры готаў заключаецца ў арыентацыі на цяперашняе. Сэнс жыцця – эпатаж, знешні паказ сваёй неардынарнасці і выключнасці.

Субкультура снаўбардыстаў, байкераў і брэйкераў падоб-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ная ў трансляцыі сваіх каштоўнасцей. Гэтая субкультура прапагандуе свае каштоўнасці жыцця. Балансаваць па лязу брытвы, знаходзіцца на мяжы паміж жыццём і смерцю тут ухваляецца. Нідзе так не прапагандуецца рызыка, як у гэтых групоўках. Каштоўнасцю лічыцца адзінае і непаўторнае імгненне асалоды, якое нясе з сабой адчуванне валодання сваім целам і выпрабаванне асабістага лёсу. Каштоўнасць гэтай субкультуры – у арыентацыі на цяперашняе. Але сапраўднае змяншаецца ў свядомасці індывіда да няўлоўнай кропкі імгнення. Адбываецца прабел у мінулым і будучым маладога пакалення. Сэнс жыцця абмяжоўваецца дыялогам паміж жыццём і смерцю, нябесным і зямным. Галоўнае ў гэтай субкультуры – хуткасць і спрыт. Каштоўнасць субкультуры такіх груповак – у прыстасаванні да тэхнічнага свету, да інавацый у жыцці, поўнага растварэння ў іх і з'яднання з імі. У разуменні байкераў, брэйкераў і іншых груповак жыццё не належыць да катэгорыі каштоўнасцей. Яно не сцвярджаецца як самастойная каштоўнасць. Сэнс жыцця губляе вядучую ролю, перавага надаецца асалодзе. Але аб якім геданізме можа ісці рэч, калі пасля спынення жыцця ўсе адчуванні і эмоцыі губляюць сваю моц над чалавекам?!

Маладое пакаленне інтэрпрэтуе рэчаіснасць такім чынам, каб паказаць сэнс жыцця, які моладзь сама для сябе сфарміравала. Магчыма, такое разуменне каштоўнасцей, сэнсу жыцця адбываецца па прычыне юнацкага максімалізму. Жыццёвая пазіцыя суб'екта становіцца больш памяркоўнай праз некалькі гадоў, а субкультура моладзі застаецца заўсёды юнай і бескампраміснай.

Студэнцкая моладзь у адпаведнасці са сваёй, ужо сфарміраванай карцінай свету выбірае тыя напрамкі ў субкультуры, якія супадаюць з яе арыентацыямі на каштоўнасці. Узнікненне субкультурнага руху моладзі адбываецца як следства ўзаемадзеяння сацыякультурных фактараў асяроддзя, у якіх існуе маладое пакаленне, і суб'ектыўнага разумення карціны свету. Аб'ядноўваюцца дзве катэгорыі, індывідуальныя арыентацыі і стан эпохі разуменнем сэнсу жыцця чалавека.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ